З першых вуснаў

«Асобныя гарачыя галовы ўжо адкрыта заклікаюць да вайны. Мы чуем гэтыя заявы»

Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў задуму сумеснага аператыўнага вучэння Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Саюзная рашучасць – 2022»

Адмысловы план і шэраг пытанняў па забеспячэнні бяспекі Саюзнай дзяржавы абмеркавалі на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам кіраўнікі ваеннага ведамства. Правесці сумесныя пазапланавыя мерапрыемствы па ацэнцы гатоўнасці Узброеных Сіл Саюзнай дзяржавы кіраўнікі дзвюх краін дамовіліся яшчэ ў снежні. Вызначаны мэты, задачы, склад удзельнікаў і месцы практычных дзеянняў войскаў. Кіраўніком вучэнняў з беларускага боку назначаны начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Віктар ГУЛЕВІЧ.

Па звестках Прэзідэнта, гэтым часам на граніцы з Беларуссю ў Прыбалтыйскіх краінах і Польшчы знаходзіцца больш за 30 тысяч ваеннаслужачых з тэхнікай, узбраеннем. У гэтым кантэксце ён згадаў перагаворы Расіі з НАТА. «Расія мае рацыю, што тыя (прадстаўнікі НАТА. — **«Зв.»**) хочуць завалакіціць, замяць усе гэтыя перагаворы, ідэі і падаць, быццам бы нічога не адбываецца. Мы бачым, што адбываецца. Варшава звярнулася ў НАТА з просьбай разгарнуць у дадзеным рэгіёне шматэшаланіраваную сістэму тылавога і тэхнічнага забеспячэння. Як людзі ваенныя, мы адразу задаём пытанне: навошта?» — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

Па словах Прэзідэнта, калі цяжкім узбраеннем і вайсковым кантынгентам меркавалі змагацца з наплывам мігрантаў, то зараз магчыма адсунуць ад межаў ваенных.

«Памятаеце, так і мы калісьці перад, пасля выбараў рэагавалі. Мы ім паказвалі: хлопцы, сунецеся — будзе дрэнна. Мы свае войскі потым вывелі ў месцы пастаяннай дыслакацыі. А яны, больш за тое, вылучыўшы сюды войскі і ўзбраенне, ствараюць шматэшаланіраваную абарону, вылучаюць эшалоны, тылавое забеспячэнне, гэта значыць, рыхтуюцца да нечага сур'ёзнага. Прынамсі, працяглага», — заўважае Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што таксама на тэрыторыі Польшчы і краін Балтыі на ратацыйнай аснове знаходзяцца ад 8 да 10 тысяч ваеннаслужачых Злучаных Штатаў Амерыкі.

«Амерыканцам што тут рабіць? Чаго нас, Расію папракаць, што мы тут нейкія манеўры, вучэнні праводзім, калі вы за край свету сюды перліся, што вы тут рабіць будзеце? Асобныя гарачыя галовы ўжо адкрыта заклікаюць да вайны. Мы чуем гэтыя заявы», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён адзначыў: на вялікі жаль насцярожвае абстаноўка і на паўднёвых рубяжах — то-бок з Украінай. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Украіна працягвае нарошчваць сілы, засяроджваючы падраздзяленні нацыянальнай гвардыі з «нацыяналістаў-радыкалаў».

«Гэта ўсё ў непасрэднай блізкасці да дзяржаўнай граніцы нашай краіны. Зноў жа пад выглядам таго, што будуць змагацца з мігрантамі. Ды мігранты туды ў жахлівым сне не трапяць нават. Яны не збіраюцца ва Украіну ісці. Там свае людзі бягуць з Украіны. А яны будуць абараняцца ад мігрантаў з Беларусі...» — адзначыў Прэзідэнт.

У спецаперацыі ўкраінскіх ваенных «Палессе» задзейнічана на мяжы амаль 10 тысяч ваеннаслужачых, а раней было толькі шэсць тысяч, дакладвае Прэзідэнту разведка.

«Дынаміка такая, што ідзе нарошчванне ваеннага кантынгенту на паўднёвых граніцах нашай краіны», — сказаў Прэзідэнт.

Ён нагадаў пра планы з расійскім калегам правесці сумесныя пазапланавыя мерапрыемствы на заходніх, паўднёвых межах Саюзнай дзяржавы.

«Сёння мы бачым, што нам неабходна ў гэтых заходніх, паўднёвых рэгіёнах Беларусі, «беларускім балконе» правесці салідныя вучэнні. І гэтыя вучэнні не павінны быць чыста беларускімі. Гэта павінны быць нармальныя вучэнні па адпрацоўцы пэўнай задумы ў супрацьстаянні з гэтымі сіламі — захаду (Прыбалтыка, Польшча) і поўдня (Украіны)», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Міністрам абароны Беларусі і Расіі была пастаўлена задача прапрацаваць задуму вучэння, вызначыць колькасць войскаў і ўзбраення, якое мабілізуюць у Беларусі, і якія часці будуць падключаны з Расіі.

Па словах Прэзідэнта, вучэнні запланаваны на люты. «Вызначайце дакладную дату, паведамляйце, каб нас не папракалі, што мы тут ні з сяго ні з таго нейкія войскі сцягнулі і ледзь ваяваць не збіраемся», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Падрабязней пра вучэнні і дыслакацыю войскаў на граніцах краін-суседак расказалі журналістам генералы.

Намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл — начальнік галоўнага аператыўнага ўпраўлення Павел МУРАВЕЙКА расказаў, што ў рамках дзвюх ваенных аперацый НАТА «Атлантычная рашучасць» і «Узмоцненая передавая прысутнасць» у Еўропе разгорнута больш за 12 тысяч амерыканскіх салдат са зброяй, танкамі, артылерыяй, самалётамі і верталётамі. Ахоўваюць паветраную прастору Балтыі больш за 300 ваеннаслужачых, 6—8 самалётаў Ф-16 і Ф-35.

«Гэта не можа нас не насцярожваць, бо гэтай групоўкай сёння магчыма развязаць і справакаваць любы міжнародны канфлікт. Акрамя таго, сёння працягваецца рэзанансная правакацыя, выкліканая так званым міграцыйным крызісам. Толькі ў рамках дадзенай дзейнасці на тэрыторыі памежных з намі дзяржаў разгорнута больш за 20 тысяч ваеннаслужачых. З іх 15 тысяч — прадстаўнікі сухапутных войскаў. У Прыбалтыцы больш 12 тысяч ваеннаслужачых. Гэта прадстаўнікі арміі, паліцыі, прыгранічнай службы», — паведаміў генерал-маёр.

Згодна з аперацыяй «Палессе», на граніцах Украіны з Беларуссю размешчана больш 10 тысяч ваеннаслужачых, і нарошчванне дадзенай групоўкі працягваецца, адзначае спікер.

«Гэта выклікае занепакоенасць і патрабуе ад нас аб'ектыўнай рэакцыі ў адказ. Гэта рэакцыя будзе адэкватная і празрыстая. Мы сумесна з расійскімі калегамі правядзём нечаканую праверку сіл і сродкаў рэагавання Саюзнай дзяржавы, — адзначыў Павел Муравейка. — Разам з тым на завяршальным этапе дадзенага мерапрыемства пройдзе вучэнне, задуму якога сёння зацвердзіў Прэзідэнт. Назва вядома — «Саюзная рашучасць — 2022». Склад войскаў вучэння, а таксама тэрміны яго правядзення будуць удакладнены па меры рэалізацыя мерапрыемстваў праверкі».

Нарошчванне войска на межах з-за міграцыйнага крызісу ён назваў «рэзананснай правакацыяй» Польшчы невыпадкова, бо пагрозы з-за бежанцаў не маюць нічога агульнага з працэсамі, што адбываюцца ў краіне-суседцы.

«Жадаючы прадэманстраваць сваю патрэбнасць Еўропе, узровень сваёй адказнасці перад еўрапейскімі краінамі, свае фінансавыя ўкладанні ў забеспячэнне бяспекі Еўропы, Польшча вылучае як мага больш ваенных, дэманструючы свой патэнцыял. Колькасць мігрантаў ні ў якім разе не ўплывае на колькасць ваеннаслужачых, што там знаходзяцца, — дадае Павел Муравейка. — Тут маецца нейкі больш глыбінны падыход — дэманстрацыя сваёй гатоўнасці выконваць нейкія задачы. Якія задачы могуць выконваць польскія ваенныя каля нашых граніц? Толькі правакацыйныя».

Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Віктар Гулевіч адной з рызык ваеннай бяспекі Беларусі назваў прысутнасць войскаў НАТА на тэрыторыі краін, што мяжуюць з нашай. Таму кіраўнікамі Саюзнай дзяржавы, па яго словах, прынята рашэнне аб правядзенні праверкі сіл рэагавання.

«У рамках мерапрыемства прадугледжана выкананне шэрагу задач. Праверцы падлягаюць органы кіравання, аб'яднанні, злучэнні воінскіх часцей Беларусі і Расіі. Будзе праводзіцца перагрупоўка на тэрыторыю Беларусі вялікага кантынгенту, з якім будзе адпрацоўвацца шэраг задач па абароне Саюзнай дзяржавы: на паўднёвым напрамку ў паветранай прасторы і на сушы, выкананне задач барацьбы з дыверсійна-разведвальнымі групамі, незаконнымі ўзброенымі фарміраваннямі. Будзе праведзена праверка ваенна-лагістычнай сістэмы па забеспячэнні перагрупоўкі на вялікія адлегласці», — расказаў начальнік Генштаба. Праверка сіл рэагавання пройдзе ў два этапы.

Марыя ДАДАЛКА.

«ВЫ ВЫБРАЛІ ТАКУЮ ПРАФЕСІЮ, А ЧАС ВЫБРАЎ НАС»

У суботу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на аэрадроме Мачулішчы пад Мінскам сустрэўся з міратворцамі, што прыбылі з Казахстана, паведамляе прэс-служба кіраўніка краіны.

У сваім выступленні перад байцамі Прэзідэнт адзначыў, што падзеі ў брацкай рэспубліцы — чарговая спроба знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы незалежных дзяржаў, а пагрозы, з якімі сутыкнуўся Казахстан, з'яўляюцца агульнымі для большасці дзяржаў на постсавецкай прасторы.

«Сваімі дзеяннямі, няхай без стральбы, без правядзення спецыяльных аперацый, толькі сваёй прысутнасцю ў гэтай краіне вы забяспечылі мір і парадак. Гэта быў сігнал усім, хто сёння точыць меч па перыметры беларуска-расійскіх граніц, — упэўнены Прэзідэнт. — Вы паказалі ўсім, што з намі ваяваць небяспечна. Больш за тое, немагчыма. Нас перамагчы немагчыма. Гэта галоўны вынік вашай аперацыі».

Арганізатары мяцяжу, заявіў у суботу Аляксандр Лукашэнка, мелі намер падарваць сітуацыю ў цэнтральнаазіяцкай рэспубліцы і ў цэлым дэстабілізаваць абстаноўку па перыметры Расіі, каб яе аслабіць. Прынятыя па лініі АДКБ меры дазволілі зберагчы Казахстан ад развіцця сітуацыі па самым негатыўным сцэнарыі, не далі разгарэцца чарговай «каляровай рэвалюцыі».

Па словах кіраўніка краіны, міратворчая аперацыя да дэталяў была распрацавана прэзідэнтамі Расіі і Беларусі на працягу адной гадзіны. З задумы лідараў міністэрствы абароны дэталізавалі план, і ўжо праз некалькі гадзін вылецелі першыя самалёты ў Казахстан.

Ужо ў суботу беларускія міратворцы вярнуліся ў Віцебск, дзе змаглі абняць сваіх родных.

Як мяркуе Аляксандр Лукашэнка, патэнцыял міратворчых сіл АДКБ — процідзе ад «каляровых рэвалюцый».

«Поспех вашай місіі можна расцэньваць як з'яўленне эфектыўнага механізму барацьбы з так званымі «каляровымі рэвалюцыямі». Вядома, ваяваць супраць нас дорага, вельмі стратна, загінуць мільёны людзей. А вось знутры перавярнуць і дабіцца тых жа мэт — яны прафесіяналы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны канстатаваў, што міратворцы з гонарам выканалі задачы па забеспячэнні бяспекі найважнейшых дзяржаўных, ваенных аб'ектаў Казахстана, унеслі свой значны ўклад у стабілізацыю абстаноўкі ў краіне.

«Сёння на вас раўняюцца вайскоўцы Беларусі і Расіі. Вамі ганарацца сем'і і ўвесь беларускі народ. Вы прыпаднеслі нашым вайскоўцам выдатны ўрок паводзін у падобных сітуацыях», — дадаў ён.

Словы асаблівай падзякі ад Аляксандра Лукашэнкі і Міністэрству абароны Расійскай Федэрацыі, расійскім ваенным лётчыкам, якія арганізавалі і аператыўна забяспечылі дастаўку беларускага воінскага кантынгенту ў Казахстан і назад.

Дзяржаўнымі ўзнагародамі адзначаны некаторыя з байцоў. Але, як запэўніў кіраўнік краіны, усе ўдзельнікі спецаперацыі таксама будуць узнагароджаны. Гэта даручэнне атрымаў міністр абароны Віктар Хрэнін.

Прэзідэнт падзяліўся з ваеннымі: маліў Бога, каб усе байцы вярнуліся жывыя і здаровыя. «І я шчаслівы, што гэтая аперацыя завяршылася менавіта так. Сёння вы будзеце бачыць сваіх родных, свае сем'і, многія з вас абдымуць сваіх дзетак. Гэта самае вялікае шчасце для мяне як для галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі, калі ты пасылаеш, яшчэ раз падкрэсліваю, сваіх дзяцей у нязведанае і яны вяртаюцца назад жывыя і здаровыя».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, вяртанне кантынгенту ў поўным складзе асабліва значнае з факта таго, што за забойства беларускага і расійскага вайскоўца бандыты гатовы былі заплаціць тысячы долараў. «Але вы засталіся жывыя. Ды і нашы збеглыя, і тут яшчэ засталіся мярзотнікі, якія марылі, што нехта вернецца адтуль не ў такім стане. Не атрымалася. І за гэта я ўдзячны вам (за тое, што вы збераглі сябе) і вашым камандзірам. Кожны дзень раніцай і ўвечары я проста дапытваў міністра абароны аб стане здароўя нашых вайскоўцаў. Вы выдатна зрабілі сваю працу, так, як і трэба нам, сапраўдным мужыкам. Вы выбралі такую прафесію, а час выбраў нас, і ад гэтага нікуды не падзецца», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Каментарый у тэму

У эфіры тэлеканала «Беларусь 1» **генеральны сакратар АДКБ Станіслаў ЗАСЬ** расказаў, што рашэнне аб уводзе міратворчых сіл у Казахстан прымалася вельмі хутка. «Літаральна 5 студзеня вечарам пачаліся кансультацыі на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў у тэлефонным рэжыме. Вельмі хутка быў дасягнуты кансэнсус. Усе падтрымалі зварот прэзідэнта Казахстана, таму рашэнне прымалася літаральна па гадзінах, — сказаў Станіслаў Зась. — Усе разумелі, што гэты зварот прэзідэнта краіны абгрунтаваны і адпавядае той сітуацыі, якая складаецца, стварылася для дзяржавы, і ўсе разумелі, што патрабуецца дапамога Казахстану».

Станіслаў Зась сцвярджае: прыход міратворцаў у Казахстан працверазіў некаторыя гарачыя галовы і верагодна сарваў нейкія задумы, планы злачынцаў. «Гэта ацэнка тых людзей, хто працуе ў Казахстане. Таму прыбыццё міратворцаў садзейнічала пералому гэтай сітуацыі і стабілізацыі становішча», — сказаў ён.

Увесь кантынгент міратворчых сіл будзе выведзены з тэрыторыі Казахстана, і зроблена гэта будзе хутка, канстатаваў генсек арганізацыі. «Калі надвор'е не ўмяшаецца, то, згодна з планам Міністэрства абароны Расіі, да 19 студзеня ўключна спланавана ўсіх вярнуць у пункты пастаяннай дыслакацыі», — заявіў Станіслаў Зась.